**КРЫЦУК Р.И.**
Студент исторического факультета Белорусского государственного университета, г. Минск, Беларусь

# МАНЕТЫ І МАНЕТАВІДНЫЯ ЖЭТОНЫ ЧАСОЎ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ І ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ НА ТЭРРЫТОРЫІ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Канец Першай сусветнай вайны ў Расійскай імперыі, Аўстра-Венгрыі і Няметчыне ў эканамічным плане атрымаўся даволі складаны – краіны перажывалі крызіс, які прывеў да інфляцыі і дэфіцыту грашовых сродкаў. Апошняе выклікала масавы выпуск гарадскіх (нотгельды), прыватных, армейскіх, кааператыўных грошаў – на тэрыторыі Расійскай Імперыі на кан. 90-х гадоў XX ст. даследчыкі вылучалі да 1,5 тыс. грашовых сурагатаў. Ў адрозненне ад краін Траістага саюза, большасць грашовых знакаў былі папяровымі, іх мы закранаць не будзем – паспрабуем асветліць тыя грашовыя сродкі, якія былі манетамі ці манетавіднымі жэтонамі.

Праблематыка даследвання акрэслена тым, што большасць манет была адчаканена адзінкавымі экзэмплярамі, ці яны засталіся ў праекце – таму я выношу толькі тыя асобнікі, існаванне якіх дакладна вядома. Да таго ж на тэму накладваецца праблема сучасных шматлікіх падробак, зробленых з мэтай нажывы, для продажу калекцыянерам. Асноўны сэнс артыкула – не раскрыць цалкам ўсю тэму, а толькі кратка азнаёміць з ёй.

**Падробкі.** З 30-х гадоў XX ст. на нумізматычным рынку масава з'яўляюцца срэбраныя палціннікі і рублі Мікалая II з контрмаркай 8-кутнай формы « Низложеніе Дома Романовыхъ * Мартъ 1917». Памер контрмаркі вагаецца каля 15-16 мм (іллюстр. №1). Першай ўзгадкай пра дадзеныя манеты можна лічыць з'яўленне іх ў аўкцыённым каталозе 1931 года Адольфа Хесса ў Франкфурце на Майне. Каталог быў прысвечаны рэдкім рускім манетам XIX пач. XX ст, за склад былі адказны маскоўскія нумізматы А. Сасноўскі і А. Талмачоў-Сасноўскі. Потым манеты з дадзенай контрмаркай зацікавілі калецыянераў толькі пасля 2-й сусветнай вайны – ў асобе Івана Георгіевіча Спасскага, які прыйшоў да вывадаў што, дадзеныя манеты з'яўляюцца антыкварнымі падробкамі, якія з'явіліcь на прыканцы 20-х гадоў, магчыма, на тэрыторыі Днепрапетроўска. Верагодна лічыць, што на пачатку 30-х гадоў была зроблена яшчэ адна партыя манет з контрмаркамі. На дадзены момант існуе падрабязная стацця Н. С. Маісеенка «О монетах с надчеканкой «Низложеніе Дома Романовыхъ * Мартъ 1917», якая надрукавана ў 2-м нумары часопіса «Нумізмат» за 2012 год і падрабязна раскрывае гісторыю з'яўлення і вывучэння дадзеных контрмарак.

**Гарадскія грошы. Армавір.**

Армавір – невялічкі горад на поўначы Каўказа, побач з Кіславодскам і Пяцігорскам. На пачатку 1918 года ў горадзе ўзнікае задумка выпуска ўласных грошаў. 7 студзеня ўлада ў горадзе пераходзіць да рэвалюцыйнага камітэта. Праз месяц адбываецца выпуск папяровых бон наміналам 500, 200, 100 і 50 рублёў, на сумму 4 млн. рублеў. Але гэтай эмісіі было мала, таму ў красавіку былі надрукаваны боны наміналам 300, 150, 40, 25, 10, 5 і 3 рублі. Папяровыя банкноты з-за дрэннай якасці паперы вельмі хутка зношваліся, і летам 1918 года па загаду камісара фінансаў армавірскага савета дэпутатаў П. С. Трыфанава пачаліся спробы па рэалізацыі металлічных бон. Манеты спачатку думалі рабіць з срэбра, але ў выніку адсутнасці такой колькасці метала, была абрана медзь. З дапамогай двух лепшых інжэнераў на заводзе "Армаліт" былі адліты пробнікі – яны аказаліcь няякаснымі з-за дрэннай тэхналогіі апрацоўкі штэмпеляў і складанасцей з ліццем. Тады да справы далучылі пленнага аўстрыйскага гравёра Іосіфа Задлера, які зрабіў стальныя матрыцы. Пробнікі былі атрыманы на ўсё тым жа заводзе "Армаліт". Пасля манетны двор перанеслі ў памяшканне сядзібы купца Баронава. Сыравіну для манет звезлі з ўсей акругі. Насельніцтва з ахвотай брала металічныя манеты. Праз пэўны час, з-за палітычнай і вайсковай нестабільнасці ў рэгіёне, манетны двор быў эвакуяваны і больш да сваёй дзейнасці не павяртаўся.

Знешне манеты выглядаюць так:

AV: выява двухглаваrа арла без карон і гербоў, вакол яго кругавая легенда "АРМАВИРСКОЕ ОТД. ГОСУДАРСТВЕННАГО БАНКА "

RV: ў венку з раслін легенда РАЗМЕННЫЙ ЗНАКЪ/5 РУБЛЕЙ (3 РУБЛЯ/ 1 РУБЛЬ) / 1918" (малюнак 2). Гурт рубчаты.

На дадзены момант ў літаратуры сустракаецца інфармацыя пра две серыі выпуска – першая – манеты наміналам 1, 3(з медзі), 5(з алюмінія) рублей, якая была пробнай і чаканілася на больш вялікіх манетных кружках.

Другі выпуск быў цалкам з медзі і меньшых памераў, бліскіх да памера царскіх 3,2,1 капейкі. Выдзяляюць і тып 1-рублёвікаў без века, але з арнаментам і плоскім гуртам, які не сустракаецца ў літаратуры. Ў літаратуры ёсць ўзгадкі і пра 3-рублёвікі адчаканеныя з срэбра, але без наяўнасці саміх манет іх пакуль можна лічыць фантастычнымі, як і пробную серыю. Агулам было адчаканена каля 60 тысяч рублеў.

**Адэскія 5 капеек**

Адным з самых цікавых і малавядомых выпускаў з'яўляюцца адэскія металічныя боны наміналам ў 5 капеек. На прыканцы 1917 года Адэская гарадская дума выпусціла серыю папяровых грошай наміналам 50, 25, 19, 5, 3 рублі і маркі наміналам 50, 20, 15 капеек. Таксама была адчаканена і пробная металічная манета наміналам ў 5 капеек, з латуні (малюнак 3).

AV: выява тарчы з гербам Адэсы (ўверсе фігура двухгаловага арла, ўнізе – выява якара) і колавай легендай "РАЗМЕННАЯ МАРКА г. ОДЕССА".

RV: у центры намінал "5 КОП.", вакол яго легенда "ГОРОДСКОЕ УПРАВЛЕНІЕ 1917 г."

З-за цяжкасцей, ўзнікшых пад час чаканкі манеты, і яе нізкого кошту, абумоўленым інфляцыяй, манета ў абарот не трапіла. Па неафіцыйнай інфармацыі, на дадзены момант вядома 4 экз. манеты.

**Манеты непрызнаных і часовых дзяржаўных утварэнняў. Паўночна- Каўказкі эмірат.**

Пад час вайсковага хаосу на Каўказе быў створаны т. з. Паўночна-Каўказкі эмірат – ісламская дзяржава, якая існавала ў перыяд з верасня 1919 па сакавік 1920 г. Асновай, якая аб'яднала аварцаў, інгушаў, кабардзінаў і чэчэнцаў, стала постаць Узун-Хаджы, пасля смерці якога эмірат перастаў існаваць. Узун-Хаджы кіраваў краінай як духоўны лідар – імам пад пратэктаратам Асманскай імперыі, але ў той жа самы момант і ў саюзе з бальшавікамі, якія нават трапілі ва ўрад эмірата. Сталіцай Узун-Хаджы сабе абраў аул Ведзена – былую сталіцу легендарнага Шаміля. Там былі надрукаваны і грашовыя знакі, спачатку восенню 1919 г. тры серыі наддруковак пячатак Дышнінскага (мін. замежных спраў) на грашовых знаках і бонах, якія абарочваліся на тэрыторыі Каўказа. На прыканцы 1919 года з дапамогай нямецкага афіцэра Паўля Маўрха пачаўся друк і паўнавартасных грошай - 5, 25, 50, 100, 250, 500 и 1000 (засталіся ў праекце) рублёў/ туманаў – курс быў 1 рубль да 10 туманаў.

Якасць папяровых грошай была вельмі нізкая – часам немагчыма было знайсці добрую паперу для друка. Гэтыя боны былі ў абароце ад 7 месяцаў да 2-х гадоў. Але акрамя папяровых бон былі адчаканены і паўнавартасныя манеты. Ў пачатку 1920 года па загаду міністра фінансаў Абдул-Азыма Абдуллаха пачалася распрацоўка манет наміналам ў 2/5, 5 і 10 туманаў. Манетнымі майстрамі выступілі фальшываманетчыкі, якія раней займаліcь падробкай срэбраных рублёў Мікалая II. Як і пры чаканцы Армавірскіх манет, выкарыстоўвалі металалом, які набывалі ў мясцовага насельніцтва, здымалі медзяныя прыборы з цягнікоў, перачаканьвалі мелкія наміналы Расійскай імперыі. На манетах выразаўся герб эмірата – вагі багіні правасуддзя, ў чашах якіх былі Каран і перакрыжаваныя караін і шабля. Пад гербам – традыцыйны паўмесяц з трымя зоркамі, над ім – выява цюбана. Акрамя герба, прысутнічала арабская графічная легенда. Была адчаканена невялічкая партыя манет, пасля чаго эмір прызнаў эканамічную немэтазгоднасць чаканкі. На аўкцыёнах рэальна сустракаюцца манеты наміналам ў 10 туманаў, больш дробныя наміналы не сустракаюцца – іх выпуск не быў наладжаны, а самі манеты можна лічыць фантастычнымі.

**Харэзмская Народная Савецкая Рэспубліка.** На тэрыторыі Цэнтральнай Азіі пад час рэвалюцыі і грамадзянскай вайны усталяваліся ўласныя дзяржаўныя інстытуты – гэтаму спрыяла і далекае знаходжанне ад асноўных палітычных груповак, і тое, што гэтыя тэрыторыі да захопу іх расейскімі уладамі мелі шматгадовую дзяржаўнасць. Існуючае тады Хівінскае ханства знаходзілась ў напоўзалежным стане ад Расійскай імперыі – было аўтаномнай часткай, але з сваім кіраўніком – Асфандыяр-ханам. Апошні негатыўна прыняў лютаўскую рэвалюцыю, чым выклікаў паўстанне супраць сабе на чале з Джунаід-ханам. Створаны ў Харэзме ЦК партыі (меньш за 600 чалавек) быў вельмі слабым. У лістападзе 1919 года паспрабаваў з'арганізаваць рэвалюцыйны пераварот, але няўдала. Савецкая ўлада ў Харэзме ўсталявалася толькі пасля інтэрвенцыі Чырвонай Арміі ў лютым 1920 года. На першым Харезмскім Курултае (26 красавіка 1920 г.) была сворана т. з. Харэзмская Народная Савецкая Рэспубліка. 2 кастрычніка 1924, "выражаючы волю народаў", ХНСР была ліквідавана, а яе тэрыторыя ўвайшла ў склад Узбецкай ССР, Туркменскай ССР і Каракалпацкага Аўтаномнага округа.

ХНСР была адзінай сацыялістычнай рэспублікай ў складзе СССР, якая чаканіла ўласные манеты. Ў 30-е гады была адчаканена партыя манет для сацыялістычнай Манголіі і Тувінскай Народнай Рэспублікай, але яны фармальна былі незалежнымі дзяржавамі.

Манеты чаканіліся ў перыяд з 1920 па 1921 год, з медзі і латуні, наміналам 20, 25, 100, 500 рублеў. Прыкладныя тыражы складаюцца так (цыфры акругленыя):

100 рублеў – 40 тыс. экз.
20 рублёў – 80 тыс. экз.
25 рублёў – 160 тыс. экз.
500 рублёў – 320 тыс. экз.

На аверсе манеты знаходзілася арабамоўная легенда, з адзначэннем назвы рэспублікі. На рэверсе манеты знаходзілася расейскамоўная легенда з адзначэннем намінала, выява сімвалічнага герба ў выглядзе шматкутнай зоркі і паўмесяца ці серпа, матыкі і вінаграднай лазы. Дзякуючы масавым тыражам, большасць манет ХНСР даступна для калекцыянераў.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Веровенко, О. В. Боны Армавира //Советский коллекционер. — 1965. — № 3. — С. 91—94.
2. Моісеенко, Н. С. О монетах с надчеканкой «Низложеніе Дома Романовыхъ * Мартъ 1917» // Нумизматика – 2012. - №2 (32). С.130-146.
3. Кузнецов, А.Ю. Люди, пьющие воду из Аму-Дарьи // Альманах Общества РОИ. –. М., 2012. – Книга I.
4. Пахомов, Ю. Д. Денежное обращение и эмиссии Северо-Кавказского эмирата в 1919—1920 гг. // Нумизматический сборник ГИМ. — 1971. — Вып. IV. — С 34-46.
5. Погорельский, И.В. История Хивинской революции и Хорезмской народной советской республики 1917-1924 гг. – Ленинград: Изд-во ЛГУ, 1984.
6. Рябцевич, В. Н. Нумизматика Беларуси. – Минск: Беларусь, 1995.
7. Янина, С. А. Металлические денежные знаки Хорезмской Советской Народной Республики1920-1922 гг. // Ежегодник ГИМ за 1961 год. — 1962. — С. 55—62.
8. Katalog 204. Russische Munzen des 19. und 20. Jahrhunderts. Dubletten russischer Museen. Adolph Hess Nachf. – Frankfurt A.M. – S. 51. – № 2034

Ілюстрацыі (выкарыстаны дадзеныя сайта https://www.google.by/)



Малюнак 1



Малюнак 3



Малюнак 2 – фота Армавірскага краязнаўчага музея



Малюнак 4

**БАСОВ С.В.**
Заведующий кафедрой инженерной химии и экологии Брестского государственного технического университета, г. Брест, Беларусь
**БОСАК В.Н.**
Сотрудник кафедры инженерной химии и экологии Брестского государственного технического университета, г. Брест, Беларусь
**ГНАТЮК С.П.**
Кандидат химических наук, доцент кафедры научной и прикладной фотографии института медиатехнологий Санкт-Петербургского Государственного университета кино и телевидения, г. Санкт-Петербург, Россия.

## РОЛЬ ЯНА БУЛГАКА В РАЗВИТИИ ПЕЙЗАЖНОЙ ФОТОГРАФИИ ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЫ XX ВЕКА

Фотография вошла в жизнь человека более полутора столетий тому назад. На вопрос: «сколько лет фотографии?» - легко ответить любому, кто интересовался ее историей. Вычтите из даты текущего дня 7 января 1839 г. – и вы знаете ответ на вопрос! За 170-летний период фотография пребывала в постоянном развитии, самоопределении, утверждении в правах самостоятельного вида искусства и, что бесспорно, оказала огромное влияние на развитие цивилизованного общества.

В современной жизни в фотографии утвердились следующие популярные жанры: пейзаж, натюрморт, портрет, архитектурные снимки, интерьер, жанровая фотография, фоторепортаж, панорамная фотография, репродукция.

В данной статье речь пойдет о пейзажной фотографии и, в частности, о выдающемся представителе этого жанра – нашем земляке Яне Булгаке, имя которого известно далеко за пределами нашей страны.